Vrublevskich Biblioteka

ŠALTINIS

Krynica

Biełaruskaja Narodnaja Hazeta

Vychodzić u aŭtorki i piatnicy.

№ 13 (722).
Cana 10 ct.
VILNIA, 16. II. 1940 h.
Hod vydańnia XXII.

Padpiska na hod — 5 litaŭ, na paŭhoda — 3 lity.
Zahranicu — ŭdvaja daražej.
Abviestki: za 1 mm u tekście 40 ct, za tekstam 30 ct.

Adresas red.-adm.: Vilnius, Zavalinė g-vė 1—2, tel 28-32
Adres red. i admin.: Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.
Redakcyja i administracyja adčyniena 10—14 hadz.
Redaktar pryjmaje 9—10 hadz.

22-hija ŬHODKI NIEZALEŽNAŚCI LITOŬSKAJ RESPUBLIKI

Siańnia, 16-ha lutaha prypadaje vialikaje śviata litoŭskaj dziaržavy. Siańnia minaje 22 hady ab taho času, kali Litoŭskaja Taryba ŭ 1918 h. u Vilni abvieściła Litvu niezaležnaj dziaržavaj. Siańniašni dzień jość ahulnadziaržaŭnym, a znača nia tolki litoŭskaha narodu, ale tak-ža i ŭsich tych narodaŭ, nacyjanalnych mienšaściaŭ, jakija žyvuć u Litvie, u supolnaj chacie z narodam litoŭskim. Siańniašni dzień jość tak-ža śviatam i dla biełaruskaj nacyjanalnaj mienšaści ŭ Litoŭskaj Respublicy.

Ale sioletnija ŭhodki litoŭskaj niezaležnaści źjaŭlajucca ŭhodkami asablivymi: — sioleta Litva śviatkuje hety vialiki svoj dzień u volnaj svajej stalicy Vilni. Dziela hetaha radaść hramadzian Litvy sioleta ŭ hety dzień jašče bolš jość poŭnaj i vialikaj.

Voś-ža, choć z bolšaha, kiniem vokam na minułaje litoŭskaha narodu, na tyja hałoŭnyja šlachi, pa jakich jon išoŭ i dajšoŭ da svajej niezaležnaści. Paśla Lublinskaj Unii ŭ 1569 h., pačaŭsia palityčny i kulturny zaniapad litoŭskaha narodu. U žyćci ekanamična-socyjalnym nad hetym narodam zapanavaŭ pryhon polskich panoŭ, u žyćci relihijna-kulturnym zapanavała polščyna. Narod staŭsia na svajej ułasnaj ziamli zvyčajnym niavolnikam.

Ale praŭdu kažuć, što narody nia ŭmirajuć. Hety skaz spraŭdziŭsia i tut. Čužyncy, što zapanavali nad litoŭskim narodam, užo dumali, što jon nia žyvie, što zasnuŭ na śmierć. Tymčasam ich złyja nadziei nia spraŭdzilisia. U kancy XVIII i ŭ pačatku XIX st. pa Eŭropie prakaciłasia chvala pavievu adradžeńnia narodaŭ. Ciopły hety pavieŭ dakaciŭsia i da Litvy. I jana pačała budzicca da lepšaha žyćcia — da žyćcia śviedamaha — nacyjanalnaha, da žyćcia kulturnaha, samastojnaha i hodnaha žyćcia čałavieka.

Ale na hety raz jašče nia było sudžana Litoŭskamu narodu raźvivać svaju volu i dolu pravilna i narmalna. Zanadta jašče byli varoža da jaho nastrojenyja tyja, u čyich rukach tady znachodziŭsia los litoŭskaha narodu. U 1865 h. rasiejskija carskija palityki zabaranili drukavać litoŭskija knižki i hazety,—łacinskimi litarami, jakija litoŭski narod pryniaŭšy byŭ addaŭna za svaje.

Lepšyja adnak syny litoŭskaha narodu nia spynilisia pierad hetaj trudnaściaj — jany pastaralisia drukavać litoŭskija knižki i hazety za hranicaj, u tahočasnaj Prusii i adtul dastaŭlali ich u Litvu, jakaja znachodziłasia pad Rasiejaj. Raspačałasia słaŭnaja para ŭ litoŭskim nacyjanalnym adradžeńni, para tak zvanych knihanoscaŭ. Z hetymi ideovymi ludźmi, jakija pieranosili z zahranicy litoŭskija knihi i pašyrali ich siarod litoŭskaha narodu, nie mahli spravicca carskija žandary, nie pad siłu było im heta. Kniha litoŭskaja išła ŭ narod i budziła jaho da śviedamaha nacyjanalnaha žyćcia. Litoŭskaja litaratura mnoha maje pryhožych apisańniaŭ, jak knihanoscy, naražajučy svaju svabodu i svajo časta žyćcio, niaśli ŭ narod litoŭskija knižki i jak litoŭskaja matka pry praśnicy vučyła hramaty svaich dzietak z litoŭskaj knižki.

U 1883 h. u toj-ža Prusii pačała vychodzić pieršaja litoŭskaja hazeta „Aušra", jakuju vydavaŭ dr. J. Basanovič, patryjarch litoŭskaha narodu. Heta hazeta ŭ litoŭskim adradžeńni mieła vialikaje i pryncypovaje značeńnie: ad jaje pačynajecca litoŭski nacyjanalny ruch arhanizavany, u šyrokim ideovym raźmiery, u sučasnym nacyjanalnym razumieńni.

Urešcie ŭ 1904 h. henaja carskaja zabarona litoŭskaha druku była skasavana. Pačałasia tady novaja para litoŭskaha nacyjanalnaha adradžeńnia. Prad usim pačało šparčej raźvivacca litoŭskaje drukavanaje słova i što-raz bolš abudžać u narodzie nacyjanalnuju śviedamaść. Ad hetaha času mnoha drukavałasia nia tolki litoŭskich knih, ale tak-ža i hazet. A vobak usiaho hetaha pajavilisia litoŭskija kooperatyvy, papłyło i palityčnaje žyćcio.

U 1905 h. byŭ sklikany ŭ Vilni litoŭski mnohaludny źjezd, viedamy ciapier u litoŭskaj litaratury, jak Litoŭski Sojm, jaki abjaviŭ u ramach jašče rasiejskaj imperyi aŭtanomiju dla litoŭskaha narodu z Sojmam u Vilni. Jak viedama, tady zrealizavać hetaj pastanovy jašče nie ŭdałosia: — carskaja reakcyja hetyja bujnyja rastki samastojnaha palityčnaha litoŭskaha žyćcia zadušyła. Ale ŭžo było im sudžana žyć.

Pryjšła suśvietnaja vajna,

U dzień NARODNAHA ŚVIATA, jakoje sioleta śviatkujem užo ŭ syskanaj stalicy, składajučy žycharam Vilni najlepšyja pažadańni ščaślivaha žyćcia, Usich svaich Klijentaŭ i Dastaŭščykaŭ ščyra pazdraŭlaje

LIETŪKIS
Addzieł u Vilni

Z pryčyny śviata 16 lutaha Siabroŭ svaich i Klijentaŭ ščyra pazdraŭlaje

Vilenski Kooperatyŭ
„RŪTA"

SPAUDOS FONDAS

Vilniuje, Gedimino g-vė 23, tel. 29-98
pazdraŭlaje svaich Klijentaŭ z pryčyny Śviata Niezaležnaści ŭ volnaj Stalicy.

pryniasła jana vialikuju rasiejskuju revalucyju, a razam z joj i kaniec carskamu ŭ Rasiei panavańniu. Narody, byŭšyja carskija niavolniki, pačali vyzvalacca. U radzie volnych i niezaležnych palityčna narodaŭ byŭšaj carskaj Rasiei spatykajem i narod Litoŭski.

Jak skazana vyšej, Litoŭskaja Taryba ŭ Vilni ŭ 1918 hodzie abvieściła Litvu volnaj i niezaležnaj dziaržavaj. Paśla hetaha abvieščańnia pačałosia budavańnie kankretnaje. Kaštavała jano litoŭskamu narodu niamała trudoŭ i kryvi, ale siańnia, jak bačym, narod hety jość volny i niezaležny, ščaśliva i pamysna ŭmacoŭvaje i dalej razbudoŭvaje svajo dziaržaŭnaje žyćcio.

Biełaruski narod, nia tolki jaho častka ŭ Litvie, ale i jak całaść, ciešycca razam z litoŭskim narodam u dzień jahonych vialikich i śviatych dasiahnieńniaŭ i ščyra žadaje jamu dalejšaj pamysnaści i ščaścia!...

Litoŭski Episkapat i arcyb. Jałbžykoŭski

Hazety pišuć, što 10 sakavika siol. adbudziecca ŭjezd litoŭskich biskupaŭ. Ŭjezd budzie radzicca ab spravach kaścielnaj arhanizacyi ŭ Litvie, a tak-ža ab spravie uzajemaadnosin pamiž episkapatam i Vilenskim arcybiskupam Jałbžykoŭskim.

Перабудова гораду Люцыну

(Пісьмо з Латвіі)

За апошнія 20 год нам, люцынскім беларусам, давялося перажыць шмат і добрага і благога, і прыемнага і страшнага, але найбольш жудаснымі былі дні чэрвеня залеташняга году, калі ў нас выгарэла палавіна старога гораду. Пажар цягнуўся ўвесь дзень і ноч. Выгарэў увесь цэнтр гораду, пачынаючы ад рынку праз Камароўку аж да Юрыздыкі. Згарэлі і каменіцы і драўляныя будынкі, як сьвечка пыхнуў касьцёл на гары каля старога замчышча, абгарэла драўляная вежа званіцы ў царкве, але самую царкву, хоць і была яна ў самым цэнтры пажарышча, выратавалі пажарныя, што прыехалі цягнікам і на аўтамабілях аж з Дзьвінску.

Дужа вялікага страху давялося перажыць беларускай бядноце, што жыла пад замкавай і касьцельнай гарой на беразе Вялікая Лужа. Тутака, як загарэўся касьцёл і старыя хаткі пад гарой, народ ня меў куды ўцякаць, бо ўсе шляхі былі адрэзаны агнём. Людзі кідаліся ў возера, шукаючы ў вадзе паратунку ад агня. Хто меў човен, дык ад'ехаўся на востраў, а ў каго ня было чаўноў, дык па шыю стоячы ў вадзе пільнаваліся, каб ня трапіла ў голаў якая дошка, ці галавешка, што нясьліся па паветры па-над галовамі гэтых няшчасных.

Шмат было стратаў, найбольш у найбяднейшага жыхарства, бо яно свае хаткі не мела звычаю страхаваць. Былі і людзкія ахвяры. Некалькі тыдняў пасьля пажару то там, то сям курыліся галавешкі, а ўсё жыхарства жыло ў вялікім страху і па начох не маг ло спаць, баючыся новага пажару.

Цяпер горад патроху адбудоўваецца. Новымі правіламі забаронена будаваць у цэнтры гораду драўляныя будынкі. Таму новыя будынкі ўсе мураваныя. Зроблена таксама перапляноўка пляцоў з такой разразхубай, каб больш ня было задужа маленькіх пляцоў. Рынак будзе перанесены ад царквы на новае месца.

Як гэта заўсёды бывае, — „няма ліха без дабра". Вялікі гэты пажар дапаможа скончыць вялікую перабудову гораду, якая была распачата больш 10 год назад, калі быў зацьверджаны новы плян Люцыну і да гораду былі прырэзаны новыя абшары, на якіх правялі вуліцы і пачалі будаваць новыя будынкі. На гэтым новым абшары, які ад цэнтру ідзе ў бок станцыі і ўздоўж бальшака на Рэжыцу, на былым урочышчы Плітніца і аж пад Гарбары, за мінулыя 10 год шмат пабудавана новых прыгожых будынкаў. З іх найпрыгажэйшыя і найвялікшыя: будынак дзяржаўнае латыскае гімназіі, латыскае аснаўное школы, рамесьніцкае школы, бальніцы і казармаў для батальёну пехаты, які зараз пастаўлены ў Люцыне настала. Наўкола гэтых каменіцаў павырасталі прытульныя асабнякі латыскіх чыноўнікаў, настаўніцтва і больш заможнага жыхарства гораду.

Што да нашага беларускага нацыянальнага жыцьця, дык яно, у параўнаньні з 1922—1925 гадамі, калі тутака працавала Т-ва „Бацькаўшчына" ды беларуская гімназія і па-

VALSTYBĖS DRAUDIMO ĮSTAIGA
(DZIARŽAŬNAJE BIURO STRACHOŬKI)
Kaunas, Mickevičiaus g. 5, telef. 24353 i 24354.

Inspektarat u Vilni
pry Jahajłaŭskaj vul. Nr. 14. telef. 108

Na vyhadnych varunkach strachuje:

ad ahnia,
na vypadak śmierci, dažyćcia,
ad pamoru žyvoha inventara,
šyby ad raźbićcia. —

Strachoŭščyk biare ŭdziel ŭ padziele zyskaŭ, ab čym infarmacyi daje Inspektarat u Vilni i Šmatlikija agentury.

Літоўская Рэспубліка

паводле Канстытуцыі з 12.V.1938 г.

(„Vyr. Žin." 608)

(кароткая выпіска)

Агульныя пастановы

Арт. 1. Літоўская дзяржава ёсьць сувэрэннай і незалежнай. Ягоная сувэрэннасьць належа да народу.

Арт. 2. Тэрыторыю Літоўскай дзяржавы становяць землі, граніцы каторых устанаўляюцца на падставе заключаных Літвой міжнародных дагавораў. Ня могуць яны быць адлучаны.

Арт. 3. Літоўская рэспубліка ёсьць рэспублікай. На чале яе стаіць Прэзыдэнт Рэспублікі. Ён кіруе дзяржавай.

Арт. 4. Улада дзяржавы ёсьць адналітная і непадзельная. Выконваюць яе Прэзыдэнт Рэспублікі, Сойм, Урад і Суды.

Арт. 6. Сталіцай Літвы ёсьць Вільня. На падставе уставы сталіца можа тымчасова месьціцца і ў іншым месцы.

Арт. 7. Дзяржаўным языком ёсьць язык літоўскі. Законы вызначаць, у якіх краёх Літвы і ў якіх публічных урадах, побач з літоўскім языком, могуць быць ужываныя і языкі іншыя.

Арт. 8. Дзяржаўным гэрбам ёсьць белая Пагоня на чырвоным полі. Нацыянальныя колеры на штандары: жоўты-зялёны-чырвоны.

Арт. 9. Дзяржаўныя Сьвяты: 1) Дзень 16-га лютага — на памяць угодкаў Незалежнасьці Літвы; 2) 8-га верасьня—на памяць Старадаўняй Слаўнай Мінуўшчыны Літвы.

Грамадзянства

Арт. 11. Грамадзянства набываецца нараджэньнем, жанімствам, або іншымі сямейнымі сувязямі, а таксама опцыяй ці нованабыцьцём.

Арт. 12. Грамадзянінам можа быць прызнаны:

1) Ліцьвін, які жыве ў Літоўскай Дзяржаве;

2) Асоба іншай нацыянальнасьці, якая жыла ў Літоўскай Дзяржаве прынамся праз 10 гадоў;

3) Асоба заслужаная для Літвы.

Арт. 15. Варункі і спосаб здабыцьця грамадзянства, прызнаньня грамадзянінам Літвы, адабраньня грамадзянства і страты яго—устанаўляюцца асобнымі законамі.

Правы і абавязкі грамадзян

Арт. 16. Дзяржава ёсьць падставай быту грамадзяніна, бароніць ягонай свабоды, гонару, здароўя, жыцьця і маемасьці.

Арт. 17. Грамадзянін карыстае з сваіх свабодаў у граніцах правоў іншых грамадзян... Абавязкам грамадзяніна ёсьць вернасьць Дзяржаве.

Арт. 18. Грамадзяне роўныя перад законам. Правы грамадзян ня могуць быць паменшаныя з прычыны ягонага веравызнаньня або нацыянальнасьці.

Арт. 21. Асоба грамадзяніна нятыкальная. Можа быць ён пакліканы ў суд або арыштаваны ў выпадках прадбачаных законам. Арыштаванаму ў працягу 48 гадзін ад арыштаваньня трэба ўручыць наказ аб арыштаваньні з паказаньнем прычыны арыштаваньня. Калі арыштаваны не атрымае такога наказу (пастановы), дык звальняецца.

Выхаваньне і асьвета

Арт. 36. Аснаўныя асяродкі выхаваньня і асьветы - гэта сям'я і школа...

Ар. 40. Агульнае навучаньне ёсьць прымусовым. У пачатковых школах, утрымліваных казной і самаўрадам, навука бязплатная.

Праца

Арт. 44. Кожная праца ёсьць часткай агульнай творчасьці і аднолькава заслугоўвае на пашану. Дзяржава ут-

BIEŁARUSKAJA CHRONIKA

Pomač knižkami Biełarusam—pałonnym. U Niamieččynie, jak viedama, znachodzicca ŭ paasobnych łahierach mnoha tysiač pałonnych Biełarusaŭ, žaŭnieraŭ b. polskaj armii. Pałonnyja Biełarusy patrabujuć pomačy mataryjalnaj i maralnaj. Biel. Centr. u Litvie, razumiejučy heta, i nia mohučy dać pałonnym pomačy mataryjalnaj, starajecca pamahčy im duchova ŭ formie vysyłki biełaruskich knižak. Usich Biełarusaŭ Litvy i zahranicaj Biel. Centr prosić na hetuju dobruju spravu adhuknucca; achviaravać knižki i hrošy na ich pierasyłku pałonnym. Z pryjemnaściu adznačajem zadeklaravanuju zhodu dać knižki pałonnym: Kniharniaj „Pahoniaj", hr. Mancevičam (hety apošni zaachviaravaŭ vydańni tvoraŭ M.Tanka).

Z Savieckaj Biełarusi

Nastaŭnickija kursy. U Pastavach (Zach. Biełaruś) savieckija ŭłady sarhanizavali nastaŭnickija kursy. Kursantŭ — kala 300 čałaviek. Na prażyćcio kažny kursant atrymlivaje na try dni pa 25 rubloŭ. Nastaŭniki, pa skančeńni kursaŭ, buduć pracavać u sarhanizavanych biełaruskich i inš. škołach u Pastaŭskim rajonie. Ułady buduć płacić nastaŭnikam, u zaležnaści ad ichniaha aśvietnaha cenzu, stažu i hadzin pracy, ad 250 da 600 rubloŭ u miesiac.

„A panoŭ ani śledu ani duchu". U Pastaŭščynie, jak i pa ŭsiej Biełarusi, mnoha było abšarnickich majontkaŭ, šlachockich zaścienkaŭ i inšych polskich placovak. Prad prychodam savieckaj ułady ŭsie polskija pany i šlachta paŭciakali i ciapier, pavodle dajšoŭšych da nas viestak, u Pastaŭščvnie pa palakoch „ani śledu, ani duchu". Samyja-ž biełaruskija vioski nastrojem svaim za karotki hety čas źmianilisia na lepšaje da niepaznańnia.

чаткавая школа, — стала шмат цішэйшым і незаўважным. Адпак, ня гледзячы на тое, што некаторыя з беларускіх грамадзян перажылі некаторую дэпрэсыю духа і спрабавалі нават схаваць галаву ў пясок, як стравус, беларусы асталіся беларусамі і імкненьня да свайго адраджэнскага руху ня страцілі. Не зазіраецца і далейшае асыміляцыі нашага жыхарства, бо расейская і польская школы, якія былі для нас найбольшай пагрозай, у сэнсе дэнацыяналізацыі, цяпер таксама зачыненыя. Пераватарыць-жа беларуса-праваслаўнага і беларуса-каталіка на латыша ёсьць задачай даволі цяжкай.

Люцынец

За памыснасьць Літоўскай Рэспублікі з нагоды 22-іх угодкаў незалежнасьці,

Яго Прэасьвяшчэнства

Архіепіскап Хвядос

адправіць набажэнства ў Сьвята Духаўскім Манастыры д. 16.II.1940 г. а гадзіне 11-тай.

Polšč tolki ŭ hranicach etnohrafičnych

Pavodle viestak hazet, ministr zahran. spraŭ emihranckaha polskaha ŭradu Zaleski byŭ anahdaj u Londynie i vioŭ hutarku z Chamberlainam i Halifaxam ab tym, u jakich hranicach Anhlija choča adbudavać Polšč. Pytańnie heta cikavić palakoŭ dziela taho, što Paryž i Londyn uściaž havorać ab tym, što Polšč dastanie terytoryi zaniatyja Niamieččynaj, ale ničoha nie havorać ab ziemlach biełaruskich i ukrainskich dałučanych da Savieckaj Biełarusi i da Savieckaj Ukrainy. Bolš taho: vice-ministr zahraničnych spraŭ Anhlii Butler 7 lutaha sioleta aficyjalna zajaviŭ, što adnej z metaŭ vajny jość paravarot Polščy **prava na niezaležnaje nacyjanalnaje žyćcio.**

Na asnovie ŭsiaho hetaha, hazety dachodziać da vysnaŭku, što sajuźniki dumajuć adbudavać **Polšč tolki ŭ etnohrafičnych hranicach** i što na hetym hruncie idzie nieparazumieńnie pamiž uradami: emihrancka-polskim — z adnaho boku — i francuskim i anhlickim — z druhoha.

Niamieččyna nia ŭstupaje

Ministr Dr. Goebbels u hutarcy z zahraničnymi žurnalistami zajaviŭ, što nacyjanał-socyjalisty całkom vierać Hitleru. Myłajucca-ž tyja, chto viera, što Niamieččyna pryniała-b usiaki prajekt kampramisu. Niamieččyna nia dumaje rabić nijakich ustupak u spravie Austryi, Čechasłavaččyny i Polščy i nie zhadžajecca na mir pry ŭsiakich varunkach. Pytańnie kalonijaŭ, jakoje Niamieččyna prad kanfliktam z Anhlijaj i Francyjaj vostra nie padyjmała, siahońnia ŭvachodzie ŭ pieršyja plany i mety vajny. Havoračy ab neŭtralnaści Goebbels zajaviŭ, što Niamieččyna, jak u prošłaści tak i siahońnia, hatova šanavać neŭtralnaść. Adnak Niamieččyna praciŭnaja neŭtralnaści niaščyraj, jakaja davodzić da varožych manifestacyj.

Niamiecka-Saviecki handlovy dahavor

Aficyjalna paviedamlajuć: 11 lutaha, pa pamysnym zakančeńni naradaŭ, padpisany ŭ Maskvie niamiecka-saviecki handlovy dahavor. Dahavor hety padpisany, jak rezultat imknieńniaŭ abiedźviuch staron da ustanaŭleńnia supolnaj haspadarčaj prahramy. Pavodle hetaha dahavoru, Saviecki Sajuz budzie vyvozić u Niamieččynu syrec, za katory Niamieččyna budzie płacić vyrabami pramysłovymi. Pa padpisańni hetaha dahavoru, handlovy tavaraabmien abodvuch krajoŭ u pieršym hodzie maje pieravyžšyć najvyšejšy stupień abmienu, jaki byŭ pamiž abodvumia krajami ad časoŭ suśvietnaj vajny.

рымоўваецца з бязупыннай працы. Здольнасьць грамадзяніна да працы ёсьць адначасна і багацьцем Дзяржавы.

Арт. 46. Дзяржава імкнецца, каб здольныя да працы мелі яе. Асобы, якія ад працы староняцца, могуць быць да яе змушаны.

Народная гаспадарка

Арт. 50 Дабрабыт грамадзяніна і Дзяржавы асягаецца тады, калі грамадзянін дакладна і сумленна працуе і гаспадарна спажывае.

Арт. 51. Дзяржава ахараняе права ўласнасьці... У парадку законадаўства і на мэты публічныя Дзяржава можа гэту маемасьць выкупіць прымусам.

Арт. 55. Дзяржава можа ўстанавіць абавязак працы на мэты публічныя.

Здароўе і грамадзкая апека

Арт. 57. Дзяржава стараецца аб здароўе грамадзян.

Прэзыдэнт Рэспублікі

Арт. 61. Прэзыдэнт Рэспублікі рэпрэзэнтуе Літоўскую Дзяржаву, прыймае прадстаўнікоў чужых дзяржаў, вызначае прадстаўнікоў Дзяржавы Літоўскай і робіць усё іншае даручанае Конституцыяй і інш. законамі.

Арт. 62. Прэзыдэнт Рэспублікі выбіраецца на сем гадоў. Можа ён быць і перавыбраны.

Арт. 63. Прэзыдэнтам Рэспублікі можа быць выбраны грамадзянін, які ў дзень галасаваньня скончыў 40 гадоў і мае пасыўнае выбарнае права ў Сойм.

Арт. 68. Па сьмерці Прэзыдэнта Рэспублікі або па яго най дымісіі, выбары Прэзыдэнта Рэспублікі расьпісваюцца зараз-жа.

Арт. 71 Падчас хваробы Прэзыдэнта Рэспублікі, або ягонага побыту заграніцай, заступае яго Старшыня Міністраў.

Арт. 72. Па сьмерці або дымісіі Прэзыдэнта Рэспублікі Старшыня Міністраў кіруе Дзяржавай да часу выбару новага Прэзыдэнта Рэспублікі... Кіруючы Дзяржавай Старшыня Міністраў мае поўную ўладу Прэзыдэнта Рэспублікі.

Арт. 73. Прэзыдэнт Рэспублікі не адказвае за свае урадавыя чыннасьці. За іншыя чыны Прэзыдэнт Рэспублікі ня можа быць узяты да адказнасьці датуль, пакуль кіруе Дзяржавай.

Арт. 73. Урадавы акт Прэзыдэнта Рэспублікі вымагае подпісу Старшыні Міністраў, або адпаведнага Міністра. Аднак акт Прэзыдэнта Рэспублікі, на моцы каторага назначаецца або звальняецца Старшыня Міністраў, або Дзяржаўны Кантралёр, або выражаецца згода на завядзеньне процэсу Старшыні Міністраў ці Дзяржаўнага кантралёра судовай справы за службовае праступніцтва—не вымагае подпісу Старшыні Міністраў, ані іншага Міністра.

Сойм

Арт. 75. Сойм выбіраецца на 5 гадоў...

Арт. 76. Кандыдатамі на сяброў Сойму могуць быць грамадзяне, якія кончылі трыццаць гадоў...

Арт. 77. Кандыдаты на сяброў Сойму выбіраюцца агульным, безпасярэднім, роўным і тайным галасаваньнем. Выбары адбываюцца спосабам пропорцыянальным.

Арт. 78. Галасаваць пры выбарах у Сойм маюць права грамадзяне, якія кончылі дваццаць чатыры гады...

Арт 93. Сябра Сойму не адказвае за свае прамовы сказаныя на паседжаньнях Сойму. Калі аднак у прамове сябра Сойму правініцца процю бясьпечнасьці Дзяржавы, дык можа быць пакліканы да адказнасьці на агульных асновах. На гэтых самых агульных асновах сябра Сойму адказвае за зьнявагі выказаныя ў соймавых прамовах.

Урад

Арт. 95. Урад складаецца із Стар-

Na linii Mannerheima

Francuskija hazety paviedamlajuć, što savieckaja armija 11 lutaha prałamała liniju Mannerheima. Savieckaja armija užyvała pry hetym vialikaha mnostva tankaŭ; niekatoryja z ich važyli až pa 70 tonnaŭ. Sami Saviety kažuć, što jany zabrali pry hetym 32 harmaty i 230 kulamiotaŭ. Finski-ž kamunikat z 12 lutaha, uspaminajučy ab bajoch z 11 lutaha, kaža, što z boku savieckaha brała ŭčaście niekalki dyvizyj, z artyleryjaj, tankami i samalotami. U ataku jšło 150 tankaŭ. Ataka tryvała 4 hadziny i była adbita. Raźbity pry hetym byli 72 savieckija tanki. — Finskija žaroty paćviardžajuć, što na froncie zhinuli ŭ bajoch viedamyja na ŭvieś śviet finskija spartoŭcy Conn Hockert i Heinrich Willedram.

Pakinuć pa sabie pustyniu

Maršał Mannerheim, hałoŭny kamandzier finskaj armii, u hutarcy z pradstaŭnikom francuskaj „Paris Soir“ ab sučasnaj finska-savieckaj vajnie miž inšym zajaviŭ:

„Kab skončyć hetu vajnu pieramožna, musim mieć vialikuju pomač zahranicy, ale nichto nam jaje ŭ takich raźmierach nia daść. Chaj adnak Saviety nia dumajuć, što jany ŭ Finlandyi niešta znojduć. Usiudy, skul naša armija budzie zmušana adstupić, pakinie pa sabie pustyniu“.

Front na Kaŭkazie

Žjaŭlajemsia śviedkami ŭžo troch frontaŭ: japonska kitajskaha (Daloki Ŭschod), anhlicka-francuska-niamieckaha (Zachad) i finska-saviecki (Poŭnač). Možna spadziavacca, što niezadoŭha paŭstanie jašče front treci: na Kaŭkazie, dzie byccam arhanizujecca anhlicka-francuska-turecki pachod na Baku i Ukrainu. Italjanskaja hazeta „Popolo di Roma“ ćvierdzić, što Saviety hetkaha pachodu spadziajucca i tamu pa ŭsiej Ukrainie i na pabiarežžy Čornaha Mora intensyŭna budujucca fortyfikacyi. Kirujuć hetymi rabotami byccam savieckija i niamieckija fachoŭcy.

Ameryka — miratvorcam

U suviazi z misijaj vice-ministra zahr. spraŭ Złuč.Štataŭ Paŭn. Ameryki S. Wellesa, abiedźvie vajujučyja starony pačynajuć niadvuznačna pryhataŭlacca. Francuski premjer Daladier 12 h. m. jeździŭ u hałoŭnuju kvateru francuskaha vojska, hdzie adbyvałasia važnaja narada z vajskovymi kamandzierami. Anhlicki premjer Chamberlain pačaŭ apracoŭvać mirnyja prapanovy i aficyjalna zajaviŭ, što jahony ŭrad hatovy pryniać vysokaha haścia (amerykanskaha delehata) i dać jamu patrebnyja informacyi. Ab pryhataŭleńniach druhoj starany viedama toje, što Hitler ciapier pracuje byccam nad mirnaj prapazykaj dla Ameryki. A zastupnik niamieckaha ministra zahr. spraŭ Dr. Schmidt zajaviŭ, što „kali Złuč. Štaty Paŭn. Ameryki paśla vizyty Welle'sa nie zaprapanujuć miru, dyk usia adkaznaść za dalšyja šalenstvy vajny spadzie na sumleńnie Ameryki“. Mussolini adbyŭ anahdaj važnuju naradu z vajskovymi i palityčnymi kruhami, paśla čaho mieŭ doŭhuju hutarku telefoničnuju z Hitleram.

Usie hazety skandynaŭskija uvažajuć, što padarož delehata Roosevelta—heta najpavažniejšy krok da adbudovy miru ŭ Eŭropie.

VOKAM PA ŚVIECIE

U Švecyi apošnim časam adbyvalisia revizyi i aryšty siarod tamašnich kamunistaŭ. U aficyjalnym kamunikacie paśla hetaha skazana, što ŭ Goeteborgu znojdzieny byli dokazy, što kamunisty pryhatoŭvali pieravarot.

U Rymynii nad Dunajem zdaryŭsia silny ŭzryŭ. Dapuskajuć, što heta była rabota ahientа adnej z susiednich dziaržaŭ, jaki prad tym zabiŭ stražnika. Pry ŭzryvie byli zabity try rumynskija vajskovyja i źniščana była celaja bateryja.

U Lublinščynie, jakaja pa zaniaćci ŭsiej Polščy niemcami stałasia asieliščam žydoŭ, apošnim časam, pavodle hazetnych viestak, byli bojki pamiž miascovymi sialanami i pryjezdnymi žydami. Paśla taho, jak ničoha nie pamahli prośby žydoŭ u miascovaha polskaha duchavienstva, kab jano ŭspakoiła svaich viernikaŭ, žydy sarhanizavali samaabaronu.

Žyćcio ŭ Vilni i Kraju

Ab emerytach Vilenskaha Mahistratu ŭrad pryniaŭ užo zakon. Datyča hety zakon tych emerytaŭ, jakija pracavali ad 16 lutaha 1918 h. da 27 kastryčnika 1939 h. Adpaviedny zakon ab emerytach—b. čynoŭnikach polskaj dziaržaŭnaj administracyi — budzie pryniaty ŭ skorym časie.

Paštovyja marki, jakija dahetul u Vilni možna było atrymać tolki na paštach, u skorym časie možna budzie dastać u vuličnych kioskach.

Telefonnyja aŭtomaty majuć być chutka zaviedzieny na vulicach Vilni dziela publičnaha karystańnia.

Pamieškańni „dla siabie.“ Polskaje zakonadaŭstva pazvalała ŭłaśnikam damoŭ vysialać iz svaich pamieškańniaŭ lokataraŭ, tłumačačy, što ichniaje pamieškańnie patrebnaje imža, ułaśnikam domu, samym. Litoŭskaje zakonadaŭstva hetkaha prava na vysialeńnie nie pryznaje.

Na 21,5 miljn. litaŭ, h. zn. da 363.336.165 litaŭ, uzros sioletni budžet Litoŭskaje Respubliki.

5 miljn. litaŭ pazyčyć starajecca miesta Vilnia. U hetaj spravie viadzie ciapier pierahavory ŭ Kaŭnasie burmistr m. Vilni K. Stašys.

Z elektryčnym aśviatleńniem m. Vilni niama strachu: niastača vuhla anahdaj ščaśliva vyrašyłasia i možna spadziavacca, što ŭ budučyni bolš užo nie paŭtorycca.

2641 ha na ziamielnuju reformu. Vilenskaja Akružnaja Kamisija Ziamielnaj Reformy, u vołaściach: Ihnalinskaj, Turhielskaj, Rešanskaj i Mejšaholskaj uziała 10 dvaroŭ z ahulnaj płoščaj 2641 ha z metaj skarystańnia ich dla ziamielnych nadziełaŭ. Ciapier u vilenskim vokruzie astałosia niezabranych jašče 62 dvary z ahulnaj płoščaj 15 640 ha. Miž inšymi ŭziaty dla ziamielnaj reformy dvor Spineka ŭ Verkach. Akramia parcelacyi dvaroŭ, pryhataŭlajecca komasacyja viosak.

Dr. med. B. Tołčynski
b. Asystent Kliniki U.S.B.
Chvaroby vušej, nasa i horła.
Zavalnaja 10, tel. 16-38.
Pryjmaje: 8-10 i 16-19 hadz.

BIURO Pigus Patarnavimas
Vilnius, vul. šv. Filipa 1 kv. 20 (kala kaśc. šv Jakuba) telef. 16-68).
Piša prośby u spravach sudovych, administracyjnych i inšych, tłumača na litoŭskuju movu dakumenty.

шыні Міністраў і іншых Міністраў. Адзін з Міністраў ёсьць заступнікам Старшыні Міністраў.

Арт. 102. Калі Старшыня Міністраў заступае Прэзыдэнта Рэспублікі... ня выконвае ён тады абавязкаў Старшыні Міністраў. У гэтым часе абавязкі гэтыя выконвае Заступнік Старшыні Міністраў.

Дзяржаўны бюджэт

Арт. 113. Бюджэтны год пачынаецца 1 студня і канчаецца 31 сьнежня...

Арт. 114. Рада Міністраў прадстаўляе Сойму на разгляд праект бюджэту да дня 1 лістапада.

Арт. 117. У часе, калі няма Сойму, Рада Міністраў прадстаўляе Прэзыдэнту Рэспублікі на зацьверджаньне праект бюджэту.

Адміністрацыйны лад Дзяржавы

Арт. 123. Міністэрствы кіруюць паасобнымі галінамі Дзяржавы. Да працы Міністэрства на мясцох абшар дзяржавы дзеліцца на тэрыторыяльныя адзінкі адміністрацыйныя.

Арт. 126. Дзеля стараньня аб справах мясцовых існуюць мясцовыя самаўрады...

Арт. 127. Паасобным краём Літвы можа быць нададзена права аўтанамічнага рэгуляваньня мясцовых справаў. Права аўтаноміі, граніцы і варункі аўтанамічнага рэгуляваньня мясцовых спраў устанаўляюцца законным парадкам у форме краёвага аўтанамічнага статуту.

Суд

Арт. 129. ...Суды пры выконваньні сваіх чыннасьцяў зьяўляюцца незалежнымі. Прыгавары судовыя выносяцца ад імя Літоўскай Рэспублікі...

Арт. 130. Прэзыдэнт Рэспублікі вызначаную судом кару можа дараваць цалком або часткава і можа зьмяніць кару на лягчэйшую. У выпадках прадбачаных законам Прэзыдэнт Рэспублікі можа вярнуць адабранае ці агранічанае Судом права.

Арт. 131. На цэлым абшары дзяржавы існуе адзін Найвышэйшы Суд. Ёсьць гэта Найвышэйшы Трыбунал.

Абарона Дзяржавы

Арт. 133. Усе грамадзяне бароняць Дзяржаву. Войска гэта ядро абароны.

Арт. 135. Галоўным Камандзерам Збройных Сілаў ёсьць Прэзыдэнт Рэспублікі...

Арт. 139. У выпадку небясьпекі для публічнага парадку, або бясьпечнасьці Дзяржавы, можа быць у Дзяржаве або ў ягонай часьці абвешчаны вынятковы стан, стан узмоцненай ахароны або стан абароны Дзяржавы.

Кантроля Дзяржавы

Арт. 144. Дзяржаўны Кантралёр кіруе Дзяржаўнай кантроляй. Прэзыдэнт Рэспублікі назначае і звальняе Дзяржаўнага Кантралёра.

Арт. 147. Дзяржаўны Кантралёр выконвае нагляд над легальнасьцю выконваньня Дзяржаўнага бюджэту.

Арт. 148. Дзяржаўны Кантралёр штогод прыгатаўляе справаздачу з выкананьня бюджэту і прадстаўляе яе на зацьверджаньне Сойму, а калі няма Сойму—дык Прэзыдэнту Рэспублікі.

Leidėjas ir Redaktorius: ADOLFAS KLIMAVIČIUS
Vydaviec i Redaktar: ADOLF KLIMOVIČ
Telefon u drukarniu i redakcyju 28-32.
Fr. Skarynos vardo Gudų Spaustuvė, Vilnius, Pylimo g-vė 1
Biel. Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, vul. Zavalnaja 1.

Valstybinė Vrublevskių vardo Biblioteka VILNIUS